аддзяліць містыку ад рэальных фактаў. Абодва яны даследуюць злачынствы і знаходзяць злачынцу. Адметнае ў асаблівасцях вобразаў: герой Конан Дойла – прафесійны шпік, герой Караткевіча стаў расследаваць злачынства воляй абставін, у якіх апынуўся.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дойл, А. Из записок о Шерлоке Холмсе. Собака Баскервилей – Москва: Искона, 1993, – 416 с.
2. Караткевіч, У. С. Дзікае паляванне караля Стаха: аповесць / Уладзімір Караткевіч, – Мінск: Маст. літ., 2008 – 493 с.


УДК 821.161.3:165.9

Навуч. У.Р. Рагозік
Навук. кір. Г.І. Кібалка, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Сярэдняя школа імя Я. Купалы № 19 г. Мінска")

# ПРЫМЯНЕННЕ РЫС ЖЫВЁЛ ДЛЯ АПІСАННЯ ХАРАКТАРУ ЧАЛАВЕКА

У дадзенай рабоце сабраны матэрыял, які паказвае, як з дапамогай рыс жывёл, можна даць характарыстыку чалавеку. Прааналізаваны вобразы жывёл як носьбітаў чалавечых якасцей у некаторых творах мастацкай літаратуры, фальклоры і ў жыцці. Разгледжаны шляхі пераносу ўласцівых жывёлам рыс на чалавека. Вызначана суаднесенасць станоўчых і адмоўных рыс характару людзей, якія раскрываюцца праз вобразы жывёл і птушак. А таксама зроблена супастаўленне разгледжанага матэрыялу з аналагічным у рускай мове.

Аб’ект даследавання: характар і яго рысы.

Прадмет даследавання: методыка апісання характару чалавека з прымяненнем рыс жывёл.

Мэта даследавання: паказаць магчымасць прымянення рыс жывёл для апісання характару чалавека.

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя задачы:

– даць тэарэтычны навуковы і літаратурны агляд паняццю характару і яго рысам;

– разгледзіць вобразы жывёл, якія з’яўляюцца носьбітамі чалавечых якасцей;

– прааналізаваць творы мастацкай літаратуры, прыказкі, фразеалагізмы, у якіх даецца характарыстыка чалавека праз вобразы жывёл;

– вызначыць шляхі пераносу ўласцівасцей жывёл на чалавека.

Метады даследавання: назіранне, абагульненне літаратуры, аналіз літаратуры, параўнанне.

Актуальнасць даследавання вызначана тым, што характару чалавека належыць важнае месца ва ўсёй чалавечай дзейнасці і жыцці ў цэлым. Асаблівасці характару можна распазнаць пры дапамозе спецыяльных навуковых метадаў дыягностыкі характару і яго рыс. Аднак у паўсядзённым жыцці мы часта выкарыстоўваем фразеалагізмы ці параўнанне з жывёламі.

Даследчая праблема заключаецца ў тым, што няма методык апісання характару чалавека з дапамогай рыс жывёл, няма адзінай класіфікацыі рыс жывёл, дадзеная тэма даследавана толькі ў рамках тэарэтычных і лінгвістычных прац.

Гіпотэза заключаецца ў меракаванні аб тым, што з дапамогай рыс жывёл можна апісаць характар чалавека.

Даследчы характар вызначаецца неабходнасцю абгрунтаванага апісання сабранага матэрыялу і падачы яго ў параўнальным аспекце.

Самастойнасць даследавання: матэрыял сабраны на аснове назіранняў, праведзены аналіз, параўнанне, сістэматызацыя.

Рэпрэзентыўнасць – асноўныя вывады зроблены на аснове супастаўляльна-параўнальнага аналізу.

Творчы падыход – зацікаўленасць аўтара работы лексікай беларускай мовы, яе асаблівасцямі, працэсамі, якія ў ёй адбываюцца.

Навуковая значнасць даследавання заключаецца ў тым, што было ўстаноўлена наступнае:

1. Назвы жывёл і птушак для характарыстыкі чалавека ўжываюцца ў гутарковым і мастацкім стылях.
2. Прыродныя характарыстыкі жывёл пераносяцца на людзей на аснове назіранняў за знешнім выглядам, дзеяннямі, фізіялогіяй, арэалам пражывання.
3. Пры характарыстыцы людзей шляхам параўнання іх з жывёламі ці птушкамі пераважаюць адмоўныя характарыстыкі.
4. З дапамогай назваў жывёл і птушак можна даць характарыстыку чалавеку.
5. Дадзеныя назоўнікі могуць характарызаваць мужчын і жанчын, дзяцей.

Практычная значнасць даследавання – практычна выкарыстоўваць распрацаваны матэрыял могуць настаўнікі на ўроках ці факультатыўных занятках, таксама ў выхаваўчых мэтах для фарміравання культуры маўлення і маўленчага этыкету школьнікаў.